ISSN 2524-2369 (print)
ISSN 2524-2377 (online)

Паступіў у рэдакцыю 05.12.2017
Received 05.12.2017

# ПЁТР ГЕОРГІЕВІЧ НІКІЦЕНКА
## (Да 75-годдзя з дня нараджэння)



2 студзеня 2018 г. спаўняецца 75 год выдатнаму беларускаму вучонаму-эканамісту, акадэміку, саветніку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктару эканамічных навук, прафесару Пятру Георгіевічу Нікіценку.

Пётр Георгіевіч нарадзіўся ў вёсцы Жыгалава Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага. Яго дзіцячыя, юнацкія гады і пачатак працоўнай дзейнасці звязаны з горадам Віцебскам. З 16 гадоў ён пачаў працаваць электразваршчыкам на домабудаўнічым камбінаце, адначасова вучыўся ў сярэдняй школе рабочай моладзі. Па заканчэнні школы быў прызваны ў Савецкую Армію, а пасля службы паступіў на планава-эканамічны факультэт (спецыяльнасць «планаванне прамысловасці») Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт), які скончыў у 1969 г. з дыпломам з адзнакай. Падчас вучобы ў інстытуце праявіліся не толькі цікавасць П. Г. Нікіценкі да навукі, але і яго выдатныя арганізатарскія здольнасці – ён быў абраны сакратаром камітэта камсамола інстытута. Маючы актыўную грамадзянскую пазіцыю, ён прымаў удзел у рабоце маладзёжных будаўнічых атрадаў; быў узнагароджаны медалём «За асваенне цалінных зямель».

Арганічнае спалучэнне сфарміраваных у юнацкія гады асабістых якасцей і рыс характару – схільнасць да глыбокага і ўсебаковага асэнсавання праблем і з'яў, патрэба ў пастаянным уласным інтэлектуальным развіцці, арганізатарскія здольнасці, ініцыятыўнасць і актыўная грамадзянская пазіцыя – спрыялі яго далейшай прафесійнай дзейнасці і абумовілі яе паспяховасць: на ўсіх дзяржаўных і кіраўнічых пасадах, якія займаў Пётр Георгіевіч, ён праявіў сябе кваліфікаваным спецыялістам, наватарам, сумленным кіраўніком, які бярэ на сябе адказнасць за даручаную справу і давераны калектыў.

У 1969 г. ён быў абраны другім сакратаром Цэнтральнага райкама камсамола г. Мінска. Затым быў пераведзены на партыйную работу ў Цэнтральны райкам КПБ г. Мінска; у 1978–1983 гг. працуе другім сакратаром Маскоўскага райкама партыі ў створаным Маскоўскім раёне г. Мінска, старшынёй Маскоўскага райвыканкама г. Мінска. Пётр Георгіевіч поруч з прафесійнай займаецца і навуковай дзейнасцю: з 1971 г. ён вучыцца ў завочнай аспірантуры пры кафедры эканомікі прамысловасці Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі. Пасля яе заканчэння ў 1976 г. абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Інтэнсіфікацыя вытворчасці і праблемы зніжэння фондаёмістасці ў прамысловасці (на прыкладзе машынабудавання і металаапрацоўкі БССР)» і яму прысвойваецца вучоная ступень кандыдата эканамічных навук.

Менавіта ў 1970-я гг. Пётр Георгіевіч сфарміраваўся як вучоны ў галіне тэорыі і метадалогіі эканамічных даследаванняў. Разам з тым сфера яго навуковых інтарэсаў была цесна звязана і з вырашэннем канкрэтных эканамічных праблем. Ён прымае ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі комплекснага плана сацыяльна-эканамічнага развіцця Цэнтральнага раёна г. Мінска на 1976–1980 гг., за што пазней быў узнагароджаны медалём ВДНГ СССР, плана сацыяльна-эканамічнага развіцця Маскоўскага раёна г. Мінска на 1981–1985 гг.

У 1981 г. ён публікуе манаграфію «Інтэнсіфікацыя вытворчасці і фондаёмістасць прадукцыі», у якой абагульнены і разгледжаны праз прызму практычнай дзейнасці вынікі яго папярэдніх навуковых даследаванняў па распрацоўцы метадалагічных асноў інтэнсіфікацыі вытворчасці,

вымярэнні і планаванні фондаёмістасці прадукцыі. За гэтую працу ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай Цэнтральнага праўлення навукова-эканамічнага таварыства СССР.

У наступныя гады дзейнасць П. Г. Нікіценкі была звязана з навукова-даследчай і педагагічнай работай у вышэйшых навучальных установах: у 1983–1991 гг. ён з`яўляўся намеснікам дырэктара па вучэбнай і навуковай рабоце Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, затым – выконваючым абавязкі дырэктара названага Інстытута і прарэктара БДУ. У 1985 г. яму прысвоена званне дацэнта. Вынікам навукова-педагагічнай працы стала распрацоўка шэрага новых спецкурсаў па пераходу эканомікі на рыначныя асновы і прагназаванню ў новых умовах гаспадарання, арганізацыя навуковых даследаванняў па актуальных эканамічных пытаннях.

У 1991 г. ён заканчвае дактарантуру Аддзялення гуманітарных навук пры ЦК КПСС і паспяхова абараняе ў г. Маскве дысертацыю на тэму «Сацыялістычнае назапашванне і фондаэканомны метад павышэння яго эфектыўнасці», у якой адным з першых у Савецкім Саюзе даказвае, што грамадскае ўзнаўленне неабходна ажыццяўляць на макраўзроўні з улікам сацыяльных і экалагічных фактараў, і распрацоўвае адпаведную трохсектарную мадэль устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця, якая прадугледжвала ўплыў сацыяльных і экалагічных фактараў. У далейшым гэтая мадэль будзе пакладзена ў аснову фарміравання сістэмы ўстойлівага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь і знойдзе адлюстраванне ў манаграфіі «Мадэль устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі: праблемы фарміравання і развіцця» (2000) і ў шэрагу Дзяржаўных праграм. У тым жа 1991 г. яму прысвоена званне прафесара (БДУ).

На пачатку 1990-х гг. П. Г. Нікіценка зноў на дзяржаўнай службе: у 1991 г. ён быў прызначаны першым намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама – старшынёй камітэта па эканоміцы і эканамічнай рэформе Мінгарвыканкама. Галоўнай яго дзейнасцю з’ўлялася распрацоўка і рэалізацыя праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця горада. У планах і праграмах, якія распрацоўваліся пад кіраўніцтвам П. Г. Нікіценкі, рэалізавалася галоўная ідэя – інавацыйная мадэль і гарманічнае ўзаемадзеянне чалавецтва і прыроды. За вялікія дасягненні ў эканамічнай навуцы ў 1994 г. яго абіраюць членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З 1995 па 1998 г. Пётр Георгіевіч з’яўляецца дырэктарам з беларускага боку сумеснага беларуска-германскага прадпрыемства «Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр», створанага як вынік супрацоўніцтва горада Мінска з зямлёй Паўночны Рэйн-Вестфалія. Знаходзячыся на гэтай пасадзе, ён уклаў шмат сіл і энергіі ў фарміраванне і развіццё цэнтра, ва ўмацаванне сувязі вучоных Беларусі і Германіі, у развіццё эканамічнай думкі. Не парываў П. Г. Нікіценка сувязі і з ВНУ, працягваў навуковую работу: у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь стварыў і ўзначаліў кафедру дзяржаўнага кіравання, апублікаваў кнігу «Жыць сваім розумам, або куды ідзе Беларусь» (1995).

Далейшая яго прафесійная дзейнасць звязана з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі – з 1998 па 2010 г. ён працуе на пасадзе дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Кампетэнцыя і багаты практычны вопыт Пятра Георгіевіча былі запатрабаваны галоўнай навуковай установай краіны для вырашэння звышскладанай задачы – глыбокага навуковага асэнсавання стану і магчымых кірункаў эканамічнага развіцця Беларусі і распрацоўкі тэарэтычнай базы фарміравання нацыянальнай эканамічнай мадэлі Рэспублікі Беларусь. Паралельна з кіраваннем Інстытутам у 2002–2009 гг. ён з’яўляецца акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, членам Прэзыдыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; з 2010 г. працуе саветнікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З’яўляючыся дырэктарам Інстытута эканомікі НАН Беларусі Пётр Георгіевіч сканцэнтраваў творчыя намаганні калектыву на распрацоўцы нацыянальнай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у кантэксце міжнароднай інтэграцыі, спрыяў працэсу фарміравання інстытута як комплекснай эканамічнай навуковай установы, якая спалучае фундаментальныя даследаванні з распрацоўкай мэтавых прыкладных праграм развіцця нацыянальнай эканомікі Беларусі. Для вырашэння гэтых задач у інстытуце былі адкрыты новыя, аптымізаваны існуючыя і адноўлены былыя кірункі навуковай дзейнасці, сярод якіх даследаванні сусветнай эканомікі

і міжнародных зносін з сусветнай супольнасцю; механізмаў макраэканамічнага рэгулявання; інавацыйнага развіцця; вывучэнне рэсурснага патэнцыялу, праблем забеспячэння эканамічнай бяспекі і шэраг іншых актуальных напрамкаў. Створаныя ў інстытуце арганізацыйныя структуры дазволілі паспяхова ажыццявіць выкананне комплексу актуальных сацыяльна-эканамічных даследаванняў.

Так, пад кіраўніцтвам П. Г. Нікіценкі інстытутам распрацаваны Комплексныя прагнозы навукова-тэхнічнага прагрэсу Рэспублікі Беларусь на 2001–2020, 2006–2025 і 2011–2030 гг., у якіх былі вызначаны прыярытэты і стратэгія інавацыйнага развіцця; распрацаваны Нацыянальныя праграмы развіцця экспарту Рэспублікі Беларусь на 2001–2005, 2006–2010, 2011–2015 гг., якія сталі навуковай асновай фарміравання экспартнай палітыкі і знешнеэканамічных зносін Рэспублікі Беларусь; Комплексныя праграмы развіцця сферы паслуг на 2004–2005 і 2006–2010 гг.; Праграма развіцця лагістычнай сістэмы Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2015 г.; Нацыянальная праграма развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2005 г.; Метадычныя рэкамендацыі па ацэнцы эфектыўнасці выкарыстання ў народнай гаспадарцы рэспублікі вынікаў навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных работ і інш. Быў выкананы шэраг дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, сярод якіх «Нацыянальная эканоміка», «Нацыянальная эканоміка і стратэгія развіцця», «Эканоміка і грамадства» і «Нацыянальная бяспека», а таксама Дзяржаўная праграма «Эканоміка і сацыяльная палітыка».

Прызнаннем вялікага ўкладу Пятра Георгіевіча ў развіццё і арганізацыю эканамічнай навукі Беларусі стала яго абранне ў 2000 г. акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Сёння П. Г. Нікіценка – вядомы вучоны ў галіне палітычнай эканоміі, эканомікі дзяржаўнага будаўніцтва і кіравання. Ім упершыню абгрунтавана і ўведзена ў сусветны навуковы ўжытак паняцце «наасферная эканоміка» як эканоміка, заснаваная на выкарыстанні планетарнага розуму-ведаў, распрацавана трохсектарная мадэль грамадскай вытворчасці, сфармуляваны эканамічныя асновы і прыярытэты інавацыйнага развіцця. Пётр Георгіевіч – аўтар тэарэтыка-метадалагічных і метадычных распрацовак па праблемах наасфернай эканомікі, інавацыйнай дзейнасці, нацыянальнай бяспекі, устойлівага развіцця Беларусі, кластэрнай арганізацыі вытворчасці. У сваіх працах акадэмік паслядоўна раскрывае палажэнне аб тым, што ўсе краіны знаходзяцца ва ўмовах аб’ектыўнага трансфармацыйнага імператыву – неабходнасці пераходу да рэалізацыі новай наасфернай планетарнай светапогляднай канцэптуальнай парадыгмы сацыяльна-эканамічнага развіцця: забеспячэння гарманізацыі макрасістэмы «Прырода – Чалавек – Грамадства», дзе каштоўнасцю і самакаштоўнасцю грамадскага ўзнаўлення становяцца Чалавек і прырода з улікам выкарыстання міжнародных цывілізацыйных стандартаў, прынцыпаў і тэндэнцый, але з захаваннем сваёй натуральнай гістарычнай, духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Вынікі даследаванняў П. Г. Нікіценкі заўсёды мелі не толькі тэарэтыка-метадалагічнае, але і важнае прыкладное значэнне, яны атрымалі ўкараненне ў сістэме вышэйшай адукацыі і дзяржаўнага кіравання Беларусі, у тым ліку ў шэрагу распрацаваных у Інстытуце эканомікі дакументаў і праграм, што вызначалі стратэгію і дынаміку развіцця дзяржавы.

Навуковыя дасягненні Пятра Георгіевіча апублікаваны больш чым у 600 навуковых працах (ім самастойна і ў суаўтарстве з іншымі навукоўцамі), у тым ліку больш 30 манаграфій, навучальных дапаможнікаў і слоўнікаў. Сярод найбольш значных з іх можна вылучыць наступныя манаграфіі: «Цывілізацыйны працэс пад вуглом наасфернага гледжання» (2002), «Імператывы інавацыйнага развіцця Беларусі: тэорыя, метадалогія, практыка» (2003), «Наасферная эканоміка і сацыяльная палітыка: стратэгія інавацыйнага развіцця» (2006), «Антыкрызісная мадэль жыццядзейнасці Беларусі» (2009), «Філасофія і ідэалогія жыццядзейнасці Беларусі: тэарэтычныя асновы антыкрызіснай мадэлі і механізмы яе рэалізацыі» (2009), «Сацыядынаміка Беларусі, Расіі і Украіны: палітыка-эканамічны аспект» (2010).

За час сваёй навуковай дзейнасці П. Г. Нікіценка падрыхтаваў і атэставаў больш за 200 дактароў і кандыдатаў эканамічных навук як з Беларусі, так і іншых краін. На працягу шэрага гадоў ён быў старшынёй экспертнага савета Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь па эканамічных навуках, узначальваў Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый пры Інстытуце эканомікі НАН Беларусі.

Пётр Георгіевіч неаднаразова адзначаўся высокімі ўрадавымі і грамадскімі ўзнагародамі за дасягненні ў галіне навукі і дзяржаўнай дзейнасці. Ён узнагароджаны медалямі СССР, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, сярэбраным медалём ВДНГ СССР, Ганаровай граматай Навукова-эканамічнага таварыства СССР «За лепшую апублікаваную работу ў галіне арганізацыі і кіравання эканомікай», медалём Францыска Скарыны, залатым медалём Саймана Кузнеца, Ганаровымі граматамі Мінгарвыканкама, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. П. Г. Нікіценка з'яўляецца лаўрэатам прэмій Прэзідэнтаў акадэмій навук (Украіны, Беларусі, Малдовы) за выдатныя навуковыя дасягненні (2002), Міжакадэмічнага міжнароднага рэйтынгу папулярнасці «Залатая фартуна» (2004); узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», граматамі міністэрстваў і ведамстваў.

Сёння, працуючы саветнікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута эканомікі, Пётр Георгіевіч працягвае навуковую распрацоўку наасфернай мадэлі развіцця чалавецтва, даследаванне ключавых праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, годна прадстаўляе беларускую эканамічную навуку на айчынных і замежных навуковых форумах і кангрэсах. Высока запатрабаваны інтэлектуальны патэнцыял і багаты навуковы і арганізацыйны вопыт акадэміка і ў навукова-экспертным асяроддзі: П. Г. Нікіценка з'яўляецца намеснікам старшыні Савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый Д 01.46.01 пры Інстытуце эканомікі НАН Беларусі, членам навуковай секцыі «Сацыяльна-эканамічныя навукі» Дзяржаўнага экспертнага савета № 8 «Сацыяльна-эканамічныя, гуманітарныя і грамадскія навукі», членам секцыі Праблемнага савета па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь пры Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі, членам Савета старэйшын пры Мінскім гарвыканкаме, членам рэдкалегій шматлікіх айчынных і міжнародных часопісаў, акадэмікам шэрага міжнародных акадэмій і асацыяцый (Міжнароднай інжынернай акадэміі, Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук, Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўнічых навук, Еўрапейскай асацыяцыі арганізацыі і кіравання вытворчасцю і інш.).

Шчыра віншуем Пятра Георгіевіча з юбілеем, жадаем моцнага здароўя, доўгай і плённай працы, новых дасягненняў у навуцы і грамадскай дзейнасці.

*Калектыў супрацоўнікаў Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*